АЎТОРАК, 6 СТУДЗЕНЯ

БЕЛАРУСЬ 1

6.00, 7.20, 8.15 Добрай раніцы, Беларусь!
7.00, 8.00 (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 23.45** Навіны.
7.05, 8.05 Навіны эканомікі.
7.10, 8.10, 19.40 Зона Х.
8.50 Слова Мітрапаліта Тадэвуша Кандрусевіча на свята Богаяўлення.
9.10 Серыял «След».
11.00, 13.00, 16.00 90 секунд.
11.05, 20.00 Серыял «Шчаслівчык Пашка».
12.10, 16.35 Серыял «Сямейныя меладрамы-3».
13.05 Дзень у вялікім горадзе.
14.00 Серыял «На шляху да сэрца».
15.15, 18.40 Навіны рэгіёна.
15.25, 0.15 Серыял «Сваты 5».
17.35 Беларуская часінка.
19.20 Сфера інтарэсаў.
21.00 Панарама.
21.45 Святочнае Набажэнства на Раство Хрыстова з Мінскага Свята-Духава кафедральнага сабора.
0.00 Дзень спорту.
0.35 Камедыя «Навагоднія мужчыны». 2-я серыя.

БЕЛАРУСЬ 2

7.00 Тэлераніца.
9.00, 21.35 Тэлебарометр.
9.05, 16.45 Серыял «Сашка».
10.10 «Fitnews».
10.45, 21.40 Дэтэктыў «Падмані мяне».
11.45, 22.35 Серыял «Віртуозы».
12.50 Ікра.
13.25 Кіпень.
13.45, 18.50 Серыял «Універ».
15.50 «Comedy woman».
17.50, 23.45 Серыял «Таксі».
20.55 Цела чалавека.
21.25 Спортлато 6 з 49.
21.30 КЕНО.
23.40 Хачу ў тэлевізар!

БЕЛАРУСЬ 3

7.15 «Дабраранак».
7.50 «Хачу ўсё ведаць!».
8.00, 12.40, 18.10 «Размовы пра духоўнае».
8.15 «Кветкі лугавыя». Меладрама.
9.35 «Таямніца душы».
10.00 «Завяшчанне прафесара Доўэля». Фантастыка.
11.30 «Подых струн». Музычная праграма. Госць: Пётр Ялфімаў.
12.10, 22.40 «Святло далёкай зоркі». Памяці народнага артыста Беларусі Сямёна Штэйна.
12.35, 18.05 «Размаўляем па-беларуску».
12.50 «Хлопец з нашага горада». Драма.
14.15 «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
14.50 «Раство ў Філармоніі». Канцэрт Дзяржаўнага акадэмічнага сімфанічнага аркестра Рэспублікі Беларусь.
16.15 «Цуды прыроды». Вялікабрытанія. Казахстан. Кітай. Чэхія.
16.40 М/ф.
18.20 «Навагоднія вечары ў Маладзечне». Уладзімір Александровіч і яго сябры.
19.30 «Бальная сукенка». Меладрама.
20.45 Калыханка.
21.05 «Песні навагодніх начэй». Выпуск першы. 30-я гады.
21.30 «Карнавальная ноч». Камедыя.

БЕЛАРУСЬ 5

6.15, 0.40 PRO спорт. Навіны.
7.00, 9.00, 12.00, 16.00 Тэніс. Турнір ВТА. Брысбен.
11.00 Біятлон. Этап Кубка свету. Паклюка. Масстарт. Мужчыны.
14.00, 20.35 Хакей. Чэмпіянат свету. U-20. Фінал.
17.55 Спорт-кадр.
18.25 Хакей. Чэмпіянат Беларусі. «Шахцёр» (Салігорск) — ХК «Гомель».
22.30 Хакей. Калядны турнір. Беларусь — Швейцарыя.

АНТ

6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00 (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
6.05 «Наша раніца».
9.05 Камедыя «За вітрынай універмага».
11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00 Навіны спорту.
11.10 Серыял «Балабон».
13.10 «Мужчынскае/Жаночае».
14.05 «Сам-насам з усімі».
15.05 «Каханне і галубы». Нараджэнне легенды.
16.15 Канцэрт Алены Ваенгі.
18.20 «Няхай гавораць».
20.00 Час.
21.05 Серыял «Адліга».
23.05 «Цудатворцы XX стагоддзя».
0.00 Камедыя «Снежны анёл».
1.55 Начныя навіны.

СТБ

6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 «24 гадзіны».
6.10, 17.20 «Міншчына».
6.20, 16.10 «Глядзець усім!».
6.35, 18.30 «Нам і не снілася»: «Грандыёзны мужчынскі падман».
7.40, 20.10, 22.55 «СТБ-спорт».
7.45, 16.55 «Далёкія сваякі».
8.00 «Зорны рынг. Навагодняя бітва хітоў «Назад у 70-я!».
9.05 «Дарагая перадача».
9.40 «Такі лёс».
10.40, 13.50, 16.50 «Гарады, якія спяваюць».
10.45, 17.30 «Званая вячэра».
11.40 «Сямейныя драмы».
12.35 «Не хлусі мне!».
13.55 Маст. фільм «Бэтмен вяртаецца».
20.00 «Сталічныя падрабязнасці».
20.15 Фільм-казка «Залаты компас».
23.00 «Аўтапанарама».
23.25 Маст. фільм «Фанфан-цюльпан».

МІР

6.00 М/ф.
10.00, 16.00, 19.00 Навіны (бягучы радок).
10.15, 1.50 Маст. фільм «Пунсовыя ветразі».
11.50 Маст. фільм «Цуд».
13.50 Маст. фільм «Блізнюк».
16.15 Серыял «Лэдзі-дэтэктыў міс Фрайні Фішэр».
18.05 Серыял «Маленькія тайны вялікіх людзей».
19.15 Серыял «Адлюстраванне».
21.15 Маст. фільм «Залатыя нажніцы».
23.00 Раство Хрыстова. Трансляцыя з Масквы.
1.00 Дак. фільм «З нагоды. З Богам!».
3.25 Маст. фільм «Волга-Волга».

РТР—БЕЛАРУСЬ

7.00 «ХА». Маленькія камедыі.
7.30 Маст. фільм «Шлях да сэрца мужчыны».
9.15 Маст. фільм «Дзьмухавец».
11.00, 14.00, 20.00 Весткі.
11.15 «Калядная «Песенька года».
12.30, 14.15, 17.00 Серыял «Сэрца маці».
13.50, 16.50, 19.50, 23.55 Навіны — Беларусь.
20.35 Маст. фільм «Дом спячых прыгажунь».



0.05 Весткі. Спецыяльны выпуск.
0.10 Раство Хрыстова. Трансляцыя ўрачыстага богаслужэння.

НТБ—БЕЛАРУСЬ

6.25, 8.20 Серыял «Гончыя».
8.00, 10.00, 13.00, 19.00 Сёння.
9.10 Серыял «Дарожны патруль».
10.20 Серыял «Вяртанне Мухтара».
12.05, 13.20 Серыял «Псеўданім «Албанец».
15.55 «Гатуем з Аляксеем Зіміным».
16.25 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».
19.20 Серыял «Павуцінне».
22.50 Камедыя «Алмаз у шакаладзе».
0.25 Серыял «Кляймо».

8 КАНАЛ

7.00, 13.15, 19.40, 21.00, 23.50 «Надвор'е».
7.05, 16.00 Мультпарад.
7.30 Камедыя «Добрая жанчына».
9.10, 16.50 «Кінаблакнот».
9.20, 15.15 «Тэлемагазін».
9.40 Серыял «Айцец Браўн».
10.30 «Кулінарная праграма».
11.00 Меладрама «У люстэрка два твары».
13.20 Серыял «Чарцяня».
16.30 «Золата маўчання».
17.00 Серыял «Боскае нараджэнне».
17.35 Серыял «Эўрыка».
18.30 Серыял «Ведзьмы ўсходняга ўзбярэжжа».
19.20 «Тваё здароўе».
19.45 Серыял «Спас пад бярозамі».
20.45 «Вечарніца».
21.05 «Даведнік па краінах і кантынентах».
21.15 Драма «Ганна і кароль».

ВТБ

6.00, 4.30 «PLAY».
8.00 М/ф «Смяшарыкі».
8.30, 18.10, 0.00 Скетч-шоу «6 кадраў».
9.00, 19.00 Серыял «Тарыф на мінулае».
10.00 «Навагодні тыдзень ежы».
11.00 «Наш Новы год».
14.30, 23.10 Скетч-шоу «Даеш моладзь».
15.00, 1.00 Серыял «90210: Новае пакаленне».
16.00 Фэнтэзі «Зачараваная Эла».
18.30, 0.30 «Лаві момант».
20.00 Скетчком «Сям'я 3D».
21.10 Камедыя «Востраў Нім».

КУЛЬТУРА

6.30 «Еўраньюс».
10.00 Навіны культуры.
10.20 Канікулы! «Прыгоды Тома Соера і Гекльберы Фіна». Маст. фільм . 3-я серыя.
11.30 «Старцы». Дак. серыял. «Архіепіскап Іаан Шанхайскі».
11.55 Мірэй Мацье. Канцэрт у «Алімпіі».
13.45 «Старцы». Дак. серыял. «Айцец Мікалай Гур'янаў».
14.15 «Дэльфіны скрытай камерай». Дак. фільм.
15.05 «Старцы». Дак. серыял. «Архімандрыт Гаўрыіл Ургебадзэ».
15.35 Праект года-2014. Вялікая опера.
17.20 «Старцы». Дак. серыял.
17.45 Спектаклі-легенды. Фаіна Ранеўская і Расціслаў Плят у спектаклі тэатра ім. Массавета «Далей — цішыня...»
20.15 «Марына Няёлава. Гэта было. Гэта ёсць... Фаіна Ранеўская». Частка 1-я.
20.45 «Песні кахання». Канцэрт Алега Пагудзіна ў Дзяржаўным Крамлёўскім палацы.
21.40 «Зямныя сляды Ісуса». Дак. фільм.
22.45 «Маналог». Маст. фільм.
0.20 Кацярына Максімава і Уладзімір Васільеў у балеце «Шчаўкунок».
1.55 «Мядзведзь». Маст. фільм
2.40 «Старая пласцінка». М/ф для дарослых.

НАСТАЛЬГІЯ

6.00 «Поле цудаў». 1994 год.
7.05 «Блакітны агеньчык». Фрагменты з навагодніх праграм з 1980 па 1990 год.
8.30 «Дзідзье Маруані і група «Спейс» у Маскве». 1983 год.
10.00, 4.00 Маст. фільм «Лятучая мыш».
11.10, 5.10 Хіт-парад «Астанкіна». Навагодні выпуск. 1992 год.
12.00, 18.05 Маст. фільм «Кароткія гісторыі».
12.50, 18.50 «Бамонд». 1992 год.
13.15 М/ф «Піф-паф ой-ой-ой».
13.35, 19.10 Канцэрт замежнай эстрады.
13.55, 19.40 Маст. фільм «Пра Чырвоную Шапачку».
15.00, 21.00 «Песня-86».
16.00, 22.00 «Народжаныя ў СССР». Лепшае.
17.05 «Навагодні лабірынт». Фільм-канцэрт. 1986 год.
23.00 «Калядныя сустрэчы». 1993 год. 1-я частка.
0.15 «Зорны шлях». Фільм-канцэрт з удзелам Мірэй Мацье. 1987 год.
1.35 «Ранішняя пошта». Навагодняя праграма. 1990 год.
2.20 «Кінапанарама». Навагодні выпуск. 1-я частка. 1984 год.
3.25 «Навагоднія міражы». 1991 год.

EUROSPORT

3.00, 21.25, 1.00 Ралі. Ралі-рэйд. Дакар.
10.30, 2.30 Ралі. Ралі-рэйд.
10.45, 13.15, 18.00, 0.00 Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету. Турнэ 4-х трамплінаў.
11.15, 14.00 Лыжныя гонкі. Кубак свету. Жанчыны.
11.45, 14.30 Лыжныя гонкі. Кубак свету. Мужчыны.
12.15, 2.15, 2.45 WATTS.
15.00 Лыжныя гонкі. Кубак свету.
17.00, 20.45 Горныя лыжы. Кубак свету. Мужчыны.
21.30 Дартс. Чэмпіянат свету.
1.30 Аўта- і мотаспорт.
1.45 Ралі. ERC.

КАМЕДЫЯ

6.00, 10.10, 14.35, 17.35, 22.00 Серыял «Сваты 3».
6.50 Камедыя «Ёлкі 2».
8.30 Камедыя «Ёлкі 3».
11.05 Камедыя «У джазе толькі дзяўчаты».
13.05 Камедыя «Два калядныя сабакі».
15.30 Меладрама «Нявеста, якая ўцякла».
18.30 Меладрама «Замерзлая з Маямі».
20.05, 22.50, 0.50, 2.50 Скетчком «Паміж намі».
20.20 Камедыя «Мільён на Раство».
23.10 Камедыя «Джэнтльмены, удачы!».
1.05 Камедыя «План гульні».
3.10 Серыял «Сваты 2».
4.15 Камедыя «Джунглі клічуць! У пошуках Марсупіламі».

ТБ3

6.00 М/ф.
7.55, 14.15 «Доктар І.».
8.25, 18.55, 3.20 Серыял «Каханне і пакаранне».
9.50, 5.10 Дак. серыял «Па справах няпоўнагадовых».
11.35, 18.00 Дак. серыял «Справа Астахава».
12.30, 16.35 «Шчырая размова».
13.25 Серыял «Аўрора».
14.45, 1.40 Серыял «Каменская».
15.40, 22.40 «Зорныя гісторыі».
17.30, 4.45 «Простыя складанасці».
20.40 Серыял «Шулер».
21.40, 2.25 Серыял «Брыгада».
23.20 Мюзікл «Усе кажуць, што я люблю цябе!».
0.55 Серыял «Сакрэтныя матэрыялы».

ТБ1000

6.00 Казка «Залаты Компас».
8.00 Камедыя «Атэль рамантычных спатканняў».
9.30 Камедыя «Сцюарт Літл 2».
10.55 Камедыя «Спачатку каханне, потым вяселле».
12.25 Драма «Адчыненае акно».
14.05 Камедыя «Замуж на 2 дні».
15.50 Драма «Закаханыя».
17.35 Драма «Крывавы алмаз».
20.00 Баявік «Падарожжа да цэнтра Зямлі».
21.45 Трылер «Ілюзія падману».
0.00 Драма «Самая п'яная акруга ў свеце».
2.00 Фільм жахаў «Жанчына ў чорным».
4.00 Камедыя «Нязносны Генры».

ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

6.20 Драма «Князёўна Мэры».
8.20 Прыгоды «Краіна добрых дзетачак».
9.50 М/ф «Карлік Нос».
11.20 Камедыя «Лёгкі на ўспамін».
12.50 Камедыя «Іван Броўкін на цаліне».
14.30 Камедыя «Горка!».
16.20 Драма «Легенда № 17».
18.40 Камедыя «Палярны рэйс».
20.20 Камедыя «Нянькі».
22.00 Драма «Дуброўскі».
0.20 Баявік «Спіраль».
2.20 Меладрама «Гаспадыня «Белых начэй».
4.40 Казка «Пасля дожджыку ў чацвер».

NATIONAL GEOGRAPHIC

6.00 Інжынерныя ідэі.
6.40 Гульні розуму.
7.10 Займальная навука.
7.30, 10.30 Навуковыя недарэчнасці.
7.50, 12.40 Зрабі або памры.
8.10 Дзень «Д». Ахвяра.
9.40, 14.10, 19.30 Міжнародны аэрапорт Дубай.
10.30, 15.00, 20.15 Расследаванні авіякатастроф.
11.10 Машыны: разабраць і прадаць.
12.00 Старацелі.
15.40 Самыя небяспечныя жывёлы.
16.30 Экстрэмальнае падарожжа.
17.10 Фашысцкі лагер смерці.
18.00, 3.00 Апакаліпсіс. Другая сусветная вайна.
18.45 Скарбашукальнікі.
21.00, 0.50, 3.50 Картачны фокуснік.
21.45, 1.30, 4.30 Кіраванне натоўпам.
23.15 90-я: дзесяцігоддзе, якое нас аб'яднала.
0.00, 2.20 Паранармальнае.

DISCOVERY

8.00, 10.55, 15.55 Як гэта зроблена?
8.25, 10.30, 15.30 Як гэта ўстроена?
8.50, 11.20 Як мы вынайшлі свет.
9.40, 13.50, 22.10 Хуткія і гучныя.
12.10 Паляўнічыя на рэліквіі.
13.00, 7.05 Золата джунгляў.
14.40, 6.05 Забойныя дылемы.
16.20, 4.25 У пагоні за класікай.
17.10, 19.40, 21.20 Дамы на дрэвах.
23.00 Мяцежны гараж.
23.50 Легендарны аўтамабіль.
0.40, 3.35 Склады.
1.30 Top Gear.
2.20 Маланкавыя катастрофы.
2.45 Сапраўдныя аферысты.
5.15 Махінатары.

■ Тэлесеткі

Мы вам пяём...

52 выпускі складзенага гледачамі народнага хіт-парада папулярных выканаўцаў, або 22 гадзіны, напоўненыя музыкай і пазітыўным настроем, 350 старонак сцэнарыя, а таксама безліч агучаных у эфіры разнастайных музычных навін, ад лакальных да сусветных — такія вынікі працы ў 2014-м інфармацыйна-забаўляльнага праекта тэлеканала «Беларусь 2» «Вышэй за дах».

Нагадаем, арыгінальная праграма і яе нязменны вядучы Віталь Карпанаў штотыднёва выносяць на суд публікі 11 кліпаў беларускіх выканаўцаў. Відэаролік, які цягам месяца трымаецца на першым радку, аўтаматычна пераходзіць у своеасаблівую «Галерэю славы», а з яе напрыканцы года складаецца нетыповая для музычных хіт-парадаў «Найвышэйшая адзінаццатка».

Напрыклад, па выніках мінулага года ганаровае месца ў «Галерэі славы» занялі Яўген Літвінковіч з кампазіцыяй «Да цябе», Аляксандр Кавалёў з песняй «Не гульня», Misha FM і яго «Не скажу» і Святаслаў Пазняк з кампазіцыяй «Night Trafic».

— У новым годзе мы зноў парадуем гледачоў гарачай барацьбой выканаўцаў і падрыхтуем для аўдыторыі «Вышэй за дах» выдатныя кліпы, забаўныя сюрпрызы, весялосць і ўсеагульную эйфарыю! — абяцае Віталь Карпанаў. — Са свайго боку, заклікаем гледачоў быць не проста сведкамі, а саўдзельнікамі гэтага свята жыцця — толькі ад вас залежыць, хто забярэцца на Алімп, а хто пойдзе на другі круг.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК

■

■ Слухай сваё

10 ТЫСЯЧ НАД ЗЯМЛЁЙ

Гурт «J:Морс» парадаваў старых і новых прыхільнікаў інтэрнэт-прэм'ерай: у сеціве з'явілася відэаверсія аднаго з самых незвычайных музычных праектаў мінулага года — канцэрта, які адбыўся ў лістападзе на вышыні 10 тысяч метраў падчас авіярэйса «Белавія» Мінск — Амстэрдам.

Гэтай акцыяй, як і пазнейшым «стацыянарным» канцэртам у сталіцы, гурт адзначыў уласнае 15-годдзе. Галоўная складанасць была тэхнічная — на борце паветранага судна даволі абмежаваная прастора і нельга падключаць знешнія прылады, таму давялося паклапаціцца пра гукавое абсталяванне з аўтаномнымі элементамі сілкавання... Цяпер жа на гэты рэйс змогуць трапіць усе ахвотныя — праўда, выключна віртуальна (http://youtu.be/-iMfj-yfVCU).

Дарэчы, сярод беларускіх артыстаў «J:Морс» сталі першымі, хто здзейсніў падобнае паветранае выступленне. А вось у сусветнай музыцы гэта ўжо не навіна: брытанскі поп-гурт Jamiroquai зладзіў развітальны канцэрт на борце самалёта ў 2007 годзе, з якім і трапіў у Кнігу рэкордаў Гінэса, усталяваўшы адразу некалькі рэкордаў. Зрэшты, у 2010 годзе рэкорд вышыні і масавасці пабіў спявак Джэймс Блант, які выступіў на вышыні ў 13 тысяч метраў, а сам канцэрт дзякуючы прамой трансляцыі ў радыёэфіры праслухалі дзясяткі тысяч чалавек.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК

■